## КАЛЕКТЫВУ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ З НАГОДЫ 70-ГАДОВАГА ЮБІЛЕЮ

*Шаноўныя таварышы!*

*Ад імя вучоных, выкладчыкаў, супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны горача і сардэчна віншую Вас са знамянальнай падзеяй – 70-гадовым юбілеем.*

*З вышыні сённяшняга дня прыемна азірнуцца на пройдзены шлях. Цэнтр і штаб айчыннай навукі паспяхова пераадольваў усе змяненні і пераўтварэнні. Па шэрагу накірункаў навуковых даследаванняў многія акадэмічныя інстытуты прызнаны вядучымі навуковымі ўстановамі Еўропы і свету.*

*Працы многіх акадэмічных вучоных узбагацілі як айчынную, так і сусветную навуку.*

*Акадэмія навук нашай рэспублікі аказала істотную дапамогу ў станаўленні і развіцці Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Гэта адлюстравалася ва ўмацаванні яго вопытнымі навуковымі кадрамі, стварэнні лепшай матэрыяльна-тэхнічнай базы, зараджэнні ўжо шырока вядомых навуковых школ.*

*Самая добрая памяць у нас засталася аб першых рэктарах нашага універсітэта акадэміках У.А.Белым і Б.В.Бокуцю, якія многае зрабілі для ўстанаўлення цесных і вельмі карысных сувязей універсітэта з многімі навуковымі акадэмічнымі ўстановамі.*

*З нагоды юбілею прыміце нашы найлепшыя пажаданні. Моцнага Вам усім здароўя, асабістага дабрабыту, новых здзяйсненняў у навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці!*

*Рэктар Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф.Скарыны, член-карэспандэнт НАН Беларусі*
*Л.А.ШАМЯТКОЎ.*


ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт





| № 1 (958) | АЎТОРАК, 19 СТУДЗЕНЯ 1999 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная |
|---|---|---|---|---|


## ВЫНІКІ ВЕЛЬМІ ДОБРЫЯ

У "Настаўніцкай газеце" за 31 снежня 1998г. былі апублікаваны інтэрв'ю з кіруючымі работнікамі адукацыі і вышэйшай школы пад рубрыкай "Чым быў для вас адметны 1998 год?" Сваё слова выказаў і рэктар нашага універсітэта член-карэспандэнт НАН Беларусі ***Л.А.Шамяткоў***. Перадрукоўваем публікацыю з названай газеты.

— Сёлета універсітэт адзначаў дзесяцігоддзе з дня прысваення яму імя вялікага Скарыны. Да гэтага юбілею ВНУ прыйшла з добрымі здабыткамі.

Увесь калектыў універсітэта, ад асістэнта да прафесара, нацэлены на навуковую працу. І гэта дае плён. Адкрыты савет для абароны дысертацый па пяці спецыяльнасцях. За некалькі апошніх гадоў колькасць дактароў навук ва універсітэце павялічылася ў паўтара раза. Сёлета павялічыўся і мой асабісты рэкорд: шосты мой вучань стаў доктарам навук і дваццаць дзевяты – кандыдатам навук.

І самае галоўнае: толькі што скончылася планавая атэстацыя універсітэта дзяржаўнай інспекцыяй ВНУ. Вынікі вельмі добрыя – і гэта сапраўдны падарунак да Новага года.

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

29-га снежня адбылося чарговае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне Савета універсітэта.

Першымі на парадку дня былі справаздачы старшынь спецыялізаваных саветаў пры ГДУ прафесараў А.М.Сердзюкова і І.В.Максімея аб праводзімай рабоце па абароне кандыдацкіх дысертацый. Ёй у цэлым дадзена станоўчая ацэнка.

Начальнік ІВЦ М.С.Далінскі праінфармаваў Савет аб выкананні яго лістападаўскага (1997 г.) рашэння "Аб стане і перспектывах развіцця камп'ютэрызацыі ва універсітэце".

Па прапанове прарэктара па навуковай рабоце прафесара Д.Р.Ліна найбольш вопытным кандыдатам навук дазволена кіраўніцтва аспірантамі.

На конкурснай аснове на вакантныя пасады абраны: А.М.Дземідзенка – загадчыкам кафедры аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі, С.С.Гіргель – прафесарам кафедры оптыкі, В.В.Ткачова і Л.М.Ярчак – старшымі выкладчыкамі кафедры фізвыхавання і спорту, Г.С.Галаўнёва – выкладчыкам гэтай жа кафедры.

На Савеце былі разгледжаны і некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## СПЕЦЫЯЛЬНЫ ФОНД ПРЭЗІДЭНТА – ТАЛЕНАВІТАЙ МОЛАДЗІ

Кіраўнік беларускай дзяржавы А.Р.Лукашэнка сваім распараджэннем зацвердзіў рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта па сацыяльнай падтрымцы таленавітых навучэнцаў і студэнтаў аб аказанні фінансавай дапамогі эфектыўна працуючым студэнцкім навукова-даследчым аб'яднанням, узнагароджанні грашовымі прэміямі навучэнцаў і студэнтаў, якія дабіліся высокіх паказчыкаў у вучобе, заахвочванні вучоных і выкладчыкаў, якія ўнеслі асабісты ўклад у развіццё здольнасцей таленавітай моладзі.

Фінансавая дапамога будзе аказана шэрагу студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый, студэнцкіх праектных бюро, студэнцкіх навуковых аб'яднанняў са сталічных і рэгіянальных ВНУ. Сярод іх — творчы клуб "Мадэліст-канструктар" нашага універсітэта, якім кіруе старшы выкладчык кафедры агульнай фізікі У.А.Замятнін.

Грашовымі прэміямі ўзнагароджаны таксама 35 навучэнцаў і студэнтаў, якія дасягнулі высокіх паказчыкаў у вучобе. А выкладчыкам і вучоным, якія ўнеслі асабісты ўклад у развіццё здольнасцей таленавітай моладзі, назначана 97 прэмій з уручэннем пасведчання спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

## ДАПАЎНЕННІ Ў ПАРАДАК РАЗМЕРКАВАННЯ ВЫПУСКНІКОЎ

Наймальнікам незалежна ад форм уласнасці забараняецца прымаць на работу выпускнікоў дзяржаўных вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія вучыліся за кошт бюджэтных сродкаў, на працягу двух гадоў пасля заканчэння навучальнай установы без пасведчання аб накіраванні на работу або даведкі аб магчымасці самастойнага працаўладкавання. Аб гэтым гаворыцца ў нядаўна прынятай пастанове ўрада.

У дакуменце адзначаецца таксама, што забараняецца звальняць выпускнікоў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў да заканчэння абавязковага тэрміну работы, за выключэннем звальнення па ініцыятыве наймальніка за адпаведныя праступкі. У выпадку невыканання гэтых патрабаванняў наймальнік павінен будзе кампенсаваць у бюджэт, з якога ажыццяўлялася фінансаванне навучанне, сродкі, затрачаныя на вучобу выпускніка.

У пастанове ўрада таксама адзначаецца, што для задавальнення патрэбнасці ў спецыялістах важнейшых галін гаспадаркі рэспублікі, сельскіх раёнаў і рэгіёнаў, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы, ажыццяўляецца мэтавая кантрактная падрыхтоўка спецыялістаў. Іх размеркаванне і працаўладкаванне ў гэтым выпадку ажыццяўляецца ў адпаведнасці з умовамі кантракта, тыпавая форма якога зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненню з Мінпрацы і Мінэканомікі.

Калі выпускнік адмовіцца адправіцца на работу згодна з заключаным кантрактам, не з'явіцца на месца размеркавання або звольніцца з месца работы без адпрацоўкі ўстаноўленага ў кантракце тэрміну, грамадзянін, які заключыў кантракт, абавязаны кампенсаваць затрачаныя на навучанне сродкі.

**(БЕЛТА).**

## У БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ АДУКАЦЫІ – ПАПАЎНЕННЕ

Напярэдадні 1999 года адбылося папаўненне Беларускай акадэміі адукацыі. Група вядомых вучоных краіны абрана яе акадэмікамі і членамі-карэспандэнтамі.

Прыемная вестка прыйшла і ў наш універсітэт. Яго першы прарэктар доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі РБ М.В.Селькін абраны членам-карэспандэнтам БелАА па аддзяленні прыродазнаўчых навук, а прарэктар па навуковай рабоце доктар тэхнічных навук, прафесар Д.Р.Лін — членам-карэспандэнтам па аддзяленні тэхнічных навук.

На выбранне членамі-карэспандэнтамі Беларускай акадэміі адукацыі названых вучоных была дадзена рэкамендацыя яе акадэміка, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, рэктара ГДУ Л.А.Шамяткова.

## ЗА НЯСТОМНЫ КЛОПАТ ПРА ДЗЯЦЕЙ

Напярэдадні Новага года пры кафедры філасофіі нашага універсітэта і абласным аддзяленні Беларускага дзіцячага фонду пад кіраўніцтвам кандыдата філасофскіх навук, дацэнта Т.П.Гаранінай створана студэнцкае таварыства "Сябра дзяцей". Яго мэта – правядзенне розных дабрачынных мерапрыемстваў, духоўнае яднанне з дзецьмі-інвалідамі, сіротамі, сацыяльна неабароненымі, дзецьмі з сем'яў ваеннаслужачых, якія загінулі ў Афганістане, з тымі, хто папраўляе здароўе ў цэнтры рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў з цэрэбральным паралічом, выхаванцамі Журавіцкай школы-інтэрната, немаўлятамі Дома груднога дзіцяці.

Шматгадовая падзвіжніцкая нястомная дзейнасць члена праўлення абласнога аддзялення Беларускага дзіцячага фонду, старшыні Савета сям'і гэтай арганізацыі Т.П.Гаранінай высока ацэнена: ёй уручаны медаль "Лаўрэат Беларускага дзіцячага фонду" і адпаведны дыплом. Іх Тамара Пятроўна ўдастоена за высакародную справу на карысць дзяцей, вялікую любоў і нястомны клопат пра іх здароўе, будучыню.

**(Наш кар.)**

*Конкурс юных*

## ПА ПРАБЛЕМАХ ЭКАЛОГІІ

14 студзеня ўпраўленне адукацыі Гомельскага аблвыканкома, наш універсітэт, абласная станцыя юных натуралістаў і абласны камітэт Беларускага саюза моладзі на базе геолага-геаграфічнага факультэта ГДУ правялі III абласны конкурс навуковых біёлага-экалагічных работ сярод школьнікаў, навучэнцаў навучальна-выхаваўчых устаноў і ўстаноў пазашкольнай адукацыі і выхавання.

Пасля пленарнага пасяджэння працавалі секцыі па праблемах экалогіі і аховы асяроддзя; экалогіі чалавека і экалагічным выхаванні; біяэкалогіі.

Было заслухана і абмеркавана звыш 30 дакладаў. Большасць з іх падрыхтавалі старшакласнікі базавай школы універсітэта № 56.

Аб выніках конкурсу мы паведамім у наступным нумары газеты.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры рускай літаратуры РОДЧАНКА Мікалай Віктаравіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

* * *

*За плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння загадчык кафедры эканамічных тэорый дацэнт САРВІРАЎ Барыс Уладзіміравіч узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

* * *

*За плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння асістэнт кафедры матаналізу ХІЛЬКО Тамара Васільеўна ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

**У ФОТААБ'ЕКТЫВЕ – ЗІМОВАЯ СЕСІЯ**

## ДНІ ТУРБОТНЫЯ, НОЧЫ БЯССОННЫЯ

Гэты час надыходзіць у студэнцкім жыцці два разы на год: зімой і ўлетку. Ён хвалюючы, напружаны, нярвовы. А імя яму — залікова-экзаменацыйная сесія. Што і казаць, не надта любімая студэнтамі гэтая пара. Але... Не вытрымаеш выпрабаванне на веды, якімі на працягу вучэбнага семестра "нашпігоўваюць" цябе выкладчыкі, можна са званнем студэнта і развітацца. Вось і штудзіруюць яны канспекты і падручнікі, часам прыхопліваючы для гэтага нават ночы.

Гэтыя фотаздымкі — толькі асобныя штрыхі з вялікага, перапоўненага эмоцыямі радасці і расчаравання, дзеяння — сесіі.



**Уладзімір Антоненка, трэцякурснік біялагічнага факультэта, да вучобы адносіцца з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю. Адсюль і вынік — ён вучыцца на "выдатна". Чарговую пяцёрку ён атрымаў на экзамене па мікрабіялогіі, які прымаў дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін М.М.Дайнэка.**



**"Шчаслівым" аказаўся білет у студэнткі гр. БА-23 філалагічнага факультэта Кацярыны Свярдловай на экзамене па рускай літаратуры. Яе адказ ацэнены вышэйшым балам.**



**Рыхтуемся... Фота У.ЧЫСЦІКА.**

**Афіцыйны аддзел**

## АБ ЗМЕНАХ У МАТЭРЫЯЛЬНЫМ ЗАБЕСПЯЧЭННІ ДЗЯЦЕЙ-СІРОТ

У інструктыўна-метадычнае пісьмо "Аб матэрыяльным забеспячэнні дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, і ўсыноўленых дзяцей" Міністэрства адукацыі і Мінфіна Рэспублікі Беларусь, прынятае ў канцы мінулага года, унесены некаторыя змяненні і дапаўненні. Так, у прыватнасці, цяпер, калі студэнту-сіраце або слухачу падрыхтоўчага аддзялення выдзяляецца бясплатная пуцёўка ў санаторый-прафілакторый і іншыя месцы арганізаванага адпачынку, кампенсацыя на харчаванне не выплачваецца за дні знаходжання на адпачынку, лячэнні.

Пры адлічэнні з навучальнай установы ў сувязі з яе заканчэннем або па іншых прычынах студэнтаў з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў і знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, адміністрацыя навучальнай установы абавязана вырашыць пытанне аб іх працаўладкаванні і забеспячэнні жыллём (інтэрнатам).

Пасля прад'яўлення даведкі аб працаўладкаванні, або рэгістрацыі ў цэнтры занятасці насельніцтва студэнтам, адлічаным з ВНУ ў сувязі з іх заканчэннем (або па іншых прычынах), выплачваецца дапамога ў памеры 2-х мінімальных заробатных плат.

У выпадку, калі выпускнікі ВНУ паступаюць у навучальныя ўстановы той жа ступені адукацыі, іх залічэнне на поўнае дзяржаўнае забеспячэнне магчыма толькі ў выпадку прад'яўлення даведкі аб тым, што па стану здароўя яны не могуць працаваць па атрыманай спецыяльнасці.

Студэнты, залічаныя на поўнае дзяржаўнае забеспячэнне, акрамя грашовых выплат на харчаванне і набыццё адзення, абутку атрымліваюць:

— матэрыяльную дапамогу штогадова ў памеры 2-х мінімальных заробатных плат за кошт стыпендыяльнага фонду;

— бясплатныя пуцёўкі ў санаторыі, дамы адпачынку (з бясплатным праездам да месца адпачынку, а таксама на час канікул у тыя ўстановы, дзе яны выхоўваліся);

— лекі, неабходныя для лячэння дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні ў дзяржаўных установах усіх тыпаў, набываюцца ў адпаведнасці з назначэннем урача за кошт сродкаў навучальнай установы.

Для забеспячэння магчымасці своечасовага прадстаўлення жылога памяшкання адміністрацыя навучальных устаноў, пад апекай якой знаходзіцца студэнт, за год да заканчэння ВНУ паведамляе выканкому мясцовага савета аб асобах, якія павінны быць забяспечаны добраўпарадкаваным жыллём.

Калі студэнтка-сірата выйшла замуж і нарадзіла дзіця, па заканчэнні водпуску па цяжарнасці і родах афармляецца водпуск па догляду за дзіцём да дасягнення ім узросту 3 гадоў з выплатай за гэты перыяд штомесячнай дзяржаўнай дапамогі на дзіця ў памеры, устаноўленым заканадаўствам. Дзяржаўнае забеспячэнне маці захоўваецца да дасягнення дзіцём узросту 1 года. Яна можа афарміць вольнае наведванне заняткаў, і за ёй захоўваецца права на дзяржзабеспячэнне, дапамогу на дзіцё і стыпендыю.

У нашым універсітэце вучыцца 35 студэнтаў-сірот. Таксама яны маюць права на набыццё адзінага білета, які дазваляе бясплатна праезд у гарадскім транспарце і наведванне ўсіх культурна-масавых мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў горадзе і універсітэце. Тым студэнтам, у каго такога білета няма, або ён знаходзіцца ў неахайным стане, неабходна звярнуцца ў прафком студэнтаў (галоўны корпус, п.1-19).

**Н.КОЛТЫШАВА,**
**старшыня прафкома студэнтаў.**

## НОВАЯ КНІГА ПРА МІЦКЕВІЧА

На апошнім пасяджэнні Скарынінскага брацтва ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Францыска Скарыны адбылася прэзентацыя кнігі "Адам Міцкевіч і нацыянальныя культуры".

Гэты зборнік на беларускай, рускай і польскай мовах — цудоўны падарунак навукоўцам, настаўнікам, краязнаўцам, усім аматарам класічнага мастацкага слова. У ім сабраны навуковыя і публіцыстычныя матэрыялы міжнароднай канферэнцыі "Адам Міцкевіч і нацыянальныя культуры" і V Карэліцкіх чытанняў "Карэліцкая зямля ў часы Адама Міцкевіча". Яны сталі падсумаваннем Года Адама Міцкевіча ў Беларусі, асэнсаваннем значэння яго спадчыны для беларускага, польскага, літоўскага, рускага і іншых народаў Еўропы. Галоўны рэдактар гэтай працы — доктар філалагічных навук Адам Мальдзіс. Аўтары — буйныя вучоныя розных краін.

*Аб паўфінале студэнцкага першынства свету па праграміраванню*

## ГАМЯЛЬЧАНЕ БЫЛІ НА ВЫШЫНІ



У снежні мінулага года ў Санкт-Пецярбургу прайшоў паўфінал студэнцкага першынства свету па праграміраванню. Спачатку адбылася камандная алімпіяда школьнікаў краін СНД, у якой прынялі ўдзел каля 60 каманд. Гомель на ёй быў прадстаўлены 2-ма камандамі. У іх уваходзілі старшакласнікі СШ №№ 27, 60, 61 і гарадскога ліцэя — пераможцы рэспубліканскай алімпіяды па праграміраванню 1998 года.

У цэлым можна лічыць выступленне гомельскіх каманд дастаткова паспяховым. Аб гэтым сведчаць такія факты: гамяльчане атрымалі персанальнае запрашэнне ўдзельнічаць у дадзеных спаборніцтвах, а лідэру гомельскай каманды Вячаславу Удавічэнку з гарадскога ліцэя прапанавана паступаць без экзаменаў у Санкт-Пецярбургскі інстытут дакладнай механікі і оптыкі, які з'явіўся арганізатарам гэтых спаборніцтваў для школьнікаў і студэнтаў. Да таго ж г.Гомель атрымаў запрашэнне прадставіць сваю каманду для ўдзелу у расійскай алімпіядзе школьнікаў па інфарматыцы ў красавіку г.г. у Санкт-Пецярбургу.

Потым праходзілі спаборніцтвы сярод студэнтаў, у якіх прынялі ўдзел і нашы школьнікі. Студэнтаў Гомеля прадстаўлялі адразу 3 каманды: дзве з нашага універсітэта па чатыры чалавекі ў кожнай — А.Кузняцоў, І.Ганчарэнка, Д.Аужын, П.Нігерыш, І.Коршунаў, А.Талкачоў, В.Налягач, Д.Дзегцяроў. Трэцюю каманду прадстаўляў БелДУТ.

Сёлета больш 140 студэнцкіх каманд выказалі гатоўнасць удзельнічаць у Санкт-Пецярбургскім паўфінале студэнцкага першынства свету па праграміраванню, таму яго арганізатары былі вымушаны правесці папярэдні адбор — чвэрцьфінальныя спаборніцтвы, у выніку якіх засталіся 86 каманд.

У паўфінале студэнтам было прапанавана 8 задач. Гомельскія каманды пачалі спаборніцтвы паспяхова: праз 40 мінут яны занялі два першыя радкі ў табліцы алімпіяды. На жаль, не пашанцавала камандзе ГДУ-1: ім дастаўся камп'ютэр, які сур'ёзна канфліктаваў з работай у сетцы — а менавіта ў ёй яны павінны былі выконваць значную частку сваёй работы, паколькі ўсім камандам былі выдзелены сеткавыя каталогі і закрыты лакальныя дыскі. У рэшце рэшт нашы рабяты неяк прыстасаваліся ( у тым ліку і працуючы на дыскетах), але ўпушчаны час наверстаць было вельмі цяжка. У выніку яны рашылі тры задачы і згубіліся недзе ў сярэдзіне турнірнай табліцы.

Каманда ГДУ-2 змагла рашыць чатыры задачы і заняла 19-е месца. Яна ўзнагароджана дыпломам III ступені чэмпіянату Расіі па праграміраванню. Каманда БелДУТа аказалася на 15 месцы і ўзнагароджана дыпломам II ступені чэмпіянату. На трэцім месцы каманда БДУ-2, у складзе якой выступаў гамяльчанін Сяргей Лагвіненка — сярэбраны прызёр міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы ў Партугаліі. Гэтая каманда атрымала дыплом I ступені і заваявала пуцёўку на фінал студэнцкага чэмпіянату свету па праграміраванню, які адбудзецца ў Галандыі.

**М.ДАЛІНСКІ,**
**начальнік ІВЦ ГДУ,**
**Л.ГАНЧАР, настаўнік інфарматыкі СШ №61,**
**кіраўнікі каманд студэнтаў і школьнікаў.**

## ПРЫГАЖОСЦЬ—ПОБАЧ

Які б ні было надвор'е на вуліцы, а тут, у выставачнай зале універсітэта, у любы час года – сонечная, светлая, радасная атмасфера. А ствараe яе мастацтва. Яно тут на правах паўнаўладнага гаспадара.

У чарговы раз выставачная зала радуе наведвальнікаў новай экспазіцыяй. Свой жывапіс, графіку прадставілі тут студэнты Гомельскага мастацкага вучылішча Наталля Кацуба, Ірына Бярнацкая, Максім Афтахаў. Нацюрморты, пейзажы, партрэты выканаы з добрай заяўкай малады талентаў на сур'ёзнае мастацтва.

10 год з імем Ф.Скарыны

# ТУТ ВУЧЫЎСЯ СКАРЫНА

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК У №№ 18,19 ЗА 15,29 СНЕЖНЯ Г.Г.)

Прагрэсіўны характар Акадэміі таго часу відаць і ў тым, што ў ёй вучылася 44% замежных студэнтаў. Гэтае становішча захоўвалася 77 гадоў (1433-1510).

Перад самым прыездам Скарыны ў Кракаўскай акадэміі трывала ўкараніўся гуманізм, ён меў шмат прыхільнікаў і прапагандыстаў, першым сярод якіх, як зазначалася, быў рэктар Ян з Асвенціма. Польскае кнігадрукаванне ў сталіцы было на вялікай вышыні. Першая польская друкарня была арганізавана тут каля 1473г., у 1491г. Швайпальт Фіёль заснаваў першую ў Еўропе славянскую друкарню кірылаўскага шрыфту. Скарына ў свабодны ад вучобы час пазнаёміўся з 4-ма выданнямі гэтай друкарні – "Актоіхам", ("Васьмігалоснік") (1491), "Часасловам" (1491),"Трыадай посная" і "Трыадай каляровай" (абедзве каля 1493). Скарыну не палохала і тое, што за першыя 2 кнігі Швайпальта Фіёля арыштавала ў 1492 г. і судзіла Кракаўская інквізіцыя (суд, тым не менш, апраўдаў яго, дзякуючы ўмяшанню горнапрамыслоўцаў Турза і Я.Тэшнора), а дзве другія Фіёль вымушаны быў выдаць без выхадных дадзеных. Ужо ў час вучобы Скарыны (1505) кракаўскі купец Ян Галер заснаваў пастаянную друкарню, а ў 1510 г. непадалёк ад Кракава — і папяровую фабрыку. Не выключана, што Ф.Скарына самае першае непасрэднае знаёмства з кнігадрукаваннем атрымаў менавіта ў гэтай кракаўскай друкарні.

З усіх відаў мастацтва гэтага часу ў Кракаве найбольшых поспехаў дасягнула скульптура. Асноўная заслуга ў гэтым належыць Віту Ствошу (1445-1533). Са сталіцай звязаны асноўныя перыяды яго творчасці (1477-1489). За гэты час ён выканаў свой галоўны твор — драўляны разны алтар у саборы святой Марыі. Як зазначаецца ў 1-ым томе "Гісторыі Польшчы" (М.,1954, с.196), "велічныя фігуры цэнтральнай кампазіцыі, больш чым па два метры вышынёй, выкананы з дрэва з віртуозным майстэрствам". Ім уласцівы дынамізм, глыбокая пачуццёвасць, вялікая ўнутраная сіла, чалавечнасць, высакароднасць. Тут Ствош па-новаму і смела ажыўляе, ачалавечвае сцэны святога пісання. У яго алтары непераўзыдзеныя пейзажныя замалёўкі — сад, напоўнены кветкамі і травой.



**Будынак галоўнай універсітэцкай бібліятэкі, узведзены ў 1930-1939 гг.**

Неадноймы любаваўся Скарына і творамі жывапісу. Ён таксама к гэтаму часу асветлены вялікай народнасцю, глыбокім чалавечым пачуццём і шчырасцю. У першую чаргу гэта адносіцца да "Малення аб кубку" (каля 1470) з цыкла ікон Аўгусцінскага касцёла, "Раства Марыі" і "Благавешчання" з алтара Смуткуючай маці боскай ў Кракаўскім саборы. Любуючыся гэтымі творамі, Скарына напаўняўся мудрасцю, пяшчотай, высакародствам, самаадданасцю, бескарыслівасцю, што ў блізкім будучым так шчодра праявілася ва ўсіх яго друкарскіх, пісьменніцкіх і іншых справах і клопатах.

Як прыемна і радасна было хадзіць па старому гораду і універсітэту, універсітэцкаму музею і ўсведамляць, што я ступаю там, дзе ступаў Скарына, гляджу на старажытныя творы мастацтва розных жанраў, на якія вось гэтак жа засяроджана і глыбакадумна глядзеў Скарына-першадрукар.

Высокі ўзровень культуры і навукі Кракаўскага універсітэта, памножаны на стагоддзі, зараз яшчэ больш здзіўляе. На тратуарах і на прыпынках — узорная чысціня. За цэлы месяц толькі адзін раз бачыў двух п'яных маладых хлопцаў, якія дэманстрацыйна гучна размаўлялі ў аўтобусе і часта паўтаралі нецэнзурнае слова. Але мала, што яно было толькі адно, дык і па сваіх уласцівасцях было значна драбнейшым, чым наша самае "мяккае" аналагічнае слова. Не пераставаў я здзіўляцца і чысціні, акуратнасці і ўтульнасці універсітэцкіх карпусоў. Прашу прабачэння ў чытачоў, што скажу колькі слоў пра туалеты. Усе яны з навейшым дарагім абсталяваннем, мылам, спецыяльнай санітарнай паперай і араматызатарамі.

Вялікая карысць, якую аказаў Кракаўскі універсітэт беларускаму і ўсім усходнеславянскім народам, адкрыўшы сонца навукі нашаму першадрукару і першаасветніку Ф.Скарыну, настойліва дыктуе, на маю думку, цеснае супрацоўніцтва паміж нашымі універсітэтамі. Тым больш, што вопыт такога супрацоўніцтва ўжо ёсць. Яшчэ ў мае студэнцкія гады, памятаю, нашы універсітэты абменьваліся студэнцкімі групамі, былі, хутчэй за ўсё, і іншыя віды супрацоўніцтва. Зараз можна было б таксама пасылаць і прымаць групы студэнтаў, публікаваць навуковыя працы палякаў у нашых навуковых выданнях, а нашы — у польскіх. Ёсць патрэба вывучыць усе матэрыялы Ягелонскай бібліятэкі перыяду 1503-1507 гадоў на прадмет знаходжання новых матэрыялаў пра Скарыну і такіх, якія праліваюць святло на яго навучанне.

Мая навуковая стажыроўка для мяне асабіста сведчыць, што Кракаўскі універсітэт і зараз прыносіць карысць Беларусі, няхай і не такую, як у 1504-1506 гадах.

**Канстанцін УСОВІЧ,**
**заг. музея-лабараторыі Ф.Скарыны**

Точка зрения

# "НЕ ГОНИТЕ" НАС НА ХУТОР

Часто мы слышим о столыпинских аграрных реформах, с которыми некоторые теоретики связывают небывалый расцвет российской нации. О Столыпине они не просто вспоминают, а глубоко скорбят и предлагают послужить Отечеству, как служил он...

Столыпинская аграрная реформа, как известно, начиналась с отмены выкупных платежей за землю и предоставления крестьянам права свободно выходить из общины. Сам Столыпин, будучи "поэтом государственного дела и государственного пафоса", считал реформу главным делом своей жизни. Он пользовался всяческой поддержкой царя, дворянства и некоторых демократических кругов. Кто-то рассчитывал с переводом крестьянства на хутора и отруба ликвидировать общину (готовую организацию бунтарей) и предотвратить новую революцию. Кто-то, наоборот, полагал, что реформа пролетаризирует деревню и тем самым приближает ее.

К проведению реформ было привлечено большое количество специалистов, превосходно знавших свое дело. К примеру, таблицы плодородия почв и в соответствии с ними цены на землю были составлены не только по уездам, но и по волостям.

Крестьян во многом принуждали к выходу из общины, но при этом продумывались и меры экономической заинтересованности. И все-таки реформа не пошла.

Почему? Да потому, что она была недостаточно радикальна и по существу вопросы о земле не решала. "Серый мужик" это понял раньше, чем его радетели.

Сама по себе благая идея сделать крестьянина подлинным хозяином, не потерявшая своей привлекательности до наших дней, столкнувшись с реальными интересами крестьян, не дала желаемых результатов.

То, что с точки зрения проповедников реформ казалось само собой разумеющимся благом, для мужика далеко не всегда было очевидным. Можно представить ход его рассуждений. Допустим, ему предлагают денежную ссуду, за которую он мог купить несколько десятин земли. При этом ставилось условие – обязательный выход из общины и переселение на хутор, которого еще нет и который еще надо построить. Имеющаяся избенка ветха, тронь ее – рассыплется. Ну, хорошо, вразумляют его: не хочешь на хутор, иди на отруб! Получишь одним куском весь надел. Не будет опять же чересполосицы.

Но земледелец размышляет. При наличии нескольких полосок больше надежд на то, что в иной год не останешься вовсе без куска хлеба. Не уродится на взгорке — получится в низине, побьет градом в одном месте — уцелеет в другом. А если тянуть, как предлагают, отруб по жребию, не прогадаю ли?

Наконец, ему советуют и предлагают переселиться в далекие края, обещают обеспечить льготный кредит. Но у него семья, дети, старики-родители. Кто решится их оставить? Далеко не каждый!

Бедняк все же выходил на собственный клин, но только для того, чтобы тут же продать, ибо обработать его все равно было нечем... Что касается крестьян, то они явились той "консервативной силой", о которую реформа и разбилась.

"Деревенская жизнь, — как отмечал писатель Сергей Васильевич Максимов, — что переход через речку по жердочке: и жердочка тонка, и речка глубока. Сорваться можно каждый день".

Ныне в пример мужику ставят западного фермера. Ему, мол, частная собственность на землю помогает добиваться результатов.

Здесь есть доля истины. В 1913 году российские крестьяне собрали по 55 пудов хлеба с десятины, а в США – 68. Разница не столь уж и существенная. Однако американский фермер с начала колонизации имел право получать 640 акров земли ( акр – 0,45 га), а с 1862 года – 162 акра.

Ему было где развернуться. По-своему были правы помещики, которые доказывали, что полное отчуждение их земель аграрный вопрос кардинально все равно не решит, а лишь еще больше подорвет товарность.

Исходя из этого, виделись два пути: массовая пролетаризация деревни, или же коллективизация, которая на деле явилась продолжением того варварства в более чудовищной форме.

Так как же решили вопрос с землей? Согласно статистики в 1916 году на один двор приходилось лишь 4 десятины земли. Средний размер частных владений составил 69,8 десятин. Товарность же сельского хозяйства в стране сократилась.

Сегодняшние наследники дела Столыпина верят в чудо. Дайте, мол, каждому "хороший кусок земли" и проблема хлеба насущного будет снята.

Как, скажите, быть с обустройством и размещением будущих фермеров? Опять расталкивать их по хуторам, строить там жилье и дороги? Знают ли ратующие за фермерство, существующее не рядом и параллельно с колхозами и совхозами, а вместо них, кто будет защищать интересы больных, нетрудоспособных, немощных крестьян, простых пенсионеров, сельскую интеллигенцию? А что будет с работниками культурно-социальной сферы?

Так стоит ли, не найдя ответов на возникающие вопросы, торопить дело? А ведь торопят! В России фактически разогнали совхозы и колхозы. И что получилось? Земля заросла кустарником, чертополохом, одуванчиками.

Спрашивается: зачем рубить сук, на котором сидишь? В 1996 году в расчете на душу населения в Беларуси произведено 580 кг зерна, 480 кг молока, 60 кг мяса. В Российской Федерации – соответственно 420, 240 и 36 кг. Это характерно для всех других отраслей сельского хозяйства.

И последнее. Я не против реформ. Но проводить их надо без излишней поспешности, разумно, с учетом чужих ошибок и богатого опыта народа.

**С.ЖАГОРОВ,**
**ст. преподаватель кафедры теории и истории государства и права.**

НА ПОЭТИЧЕСКОЙ ОРБИТЕ – НОВОЕ ИМЯ

## *Возвращение к себе*



Александр Власов – человек с оригинальным взглядом на мир, людей, искусство. В жизни он искал себя непросто: сначала услышал романтику в стуке вагонных колес – стал студентом Белорусского института инженеров железнодорожного транспорта. Правда, быстро понял, что путь Гарина-Михайловского не для него, и вернулся на классическую стезю современного писателя – стал филологом. Но и здесь поступил по-своему. Оставаясь тонким лириком в душе, научную энергию посвятил исследованию законов развития языка, а не литературы.

И к своему первому сборнику шел довольно своеобразно. Писать стихи начал рано – свидетельство тому публикации в студенческих многотиражках, в серьезной периодике. Однако какая-то неуверенность в себе, сомнение, а может, скорее, высокая требовательность – определяющая черта характера – препятствовала созданию из отдельных произведений единой картины восприятия мира глазами молодого поэта. Оригинальные сколки, интересные наблюдения никак не складывались в единую поэтическую мозаику. Наконец этот рубикон перейден, и теперь А.Власов может пригласить читателя в мир, созданный своей поэтической фантазией. Путешествие это будет весьма непростым, но именно в этом и кроется ценность подобного постижения.

**И.ШТЕЙНЕР,**
**доктор филологических наук, профессор, заведующий кафедрой белорусской литературы.**

◆ ◆ ◆

*Ночь по небу чиркает звездами,*
*Искры гасит земля.*
*Может быть, друг для друга созданы*
*Мы с тобой, – ты и я.*
*Меж созвездьями вижу снова я*
*Только взгляд серых глаз.*
*Во вселенской бездне сверхновая*
*Родилась в добрый час.*
*Звезды меркнут, хоть еще затемно,*
*Я шепчу им вослед,*
*Что найду тебя обязательно,*
*Хочешь ты или нет.*
*Пусть не скоро наше свидание,*
*Ему быть суждено.*
*Не дари мне себя без желания,*
*– Отраженье одно.*

◆ ◆ ◆

*Опять декабрь...*
*Погода минус два...*
*Какой же год?*
*А Бог с ним, с этим годом!*
*Летят снежинки, как твои слова,*
*Жестокие слова перед уходом.*
*Тому уже минуло много лет,*
*А тот декабрь со мной стоит у двери,*
*Внизу такси, в твоей руке билет...*
*И я все жду, и не желаю верить.*

◆ ◆ ◆

*Капля за каплею жизнь проливается,*
*Как мимо рта дорогое вино.*
*Кто-то сейчас на вокзале прощается.*
*Не все равно ли? Уже все равно.*

*Суетны дни и смешны, и бессмысленны.*
*Сны посылаются, знаки судьбы.*
*Кто-то в вагонном окне ищет истины,*
*Хочет их в пункте конечном добыть.*

*То, что не найдено и не доделано,*
*Так тому быть, суждено наперед.*
*Где-то на небе начертано... Где оно?*
*В следующей жизни произойдет.*

*Студэнцкія канікулы*

# ПА ПУЦЁЎКАХ – ЗА ЗДАРОЎЕМ

У дні студэнцкіх канікулаў, зразумела ж, хочацца добра адпачыць, папраўіць здароўе ў санаторыях і дамах адпачынку. Такую магчымасць цяпер, на жаль, скарыстаць могуць не ўсе жадаючыя. Так, у прыватнасці, сёлета абласной камісіяй па аздараўленню і санаторна-курортнаму лячэнню нашаму універсітэту па чарнобыльскаму фонду выдзелена 45 пуцёвак на базу адпачынку "Рамантыка", што ва ўрочышчы Клёнкі. Тут з учарашняга дня пачалі праводзіць свае канікулы юнакі і дзяўчаты ва ўзросце да 18 гадоў.

Атрымалі пуцёўкі ў санаторыі рэспублікі таксама студэнты толькі названага ўзросту. 10 чалавек адправяцца ў санаторый "Прыдняпроўскі" пад Рагачовам, дзе лечаць захворванні нярвовай і касцёва-мышачнай сістэм. Па 2 пуцёўкі выдзелена ў санаторыі "Буг" (Брэсцкая вобл.) і "Лётцы" пад Віцебскам. Там паправяць сваё здароўе студэнты з захворваннямі органаў дыхання, стрававання, кровазвароту, сардэчна-сасудзістай сістэмы.

**(Наш кар.)**

ПЫТАЙЦЕ – АДКАЗВАЕМ

# ДАПАМОГА – ПА СРОДКАХ

Распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 снежня 1998 г. "Аб аказанні адначасовай матэрыяльнай дапамогі работнікам бюджэтнай сферы" у мэтах іх сацыяльнай абароны ва ўмовах росту спажывецкіх цэн дазваляе рабіць выплату да 50 працэнтаў месячных пасадавых акладаў за кошт эканоміі сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце на 1998 г. на аплату працы работнікам арганізацый і ўстаноў бюджэтнай сферы.

Аднак такі ўзровень выплат у нашым універсітэце не атрымаўся. І пайшлі ўсялякія крыватолкі.

Пракаменціраваць сітуацыю мы папрасілі начальніка планава-фінансавага аддзела **С.Я.Пашук.**

– Па стану на 30 снежня эканомія сродкаў рэспубліканскага бюджэту, прадугледжанага на аплату працы работнікаў нашага універсітэта ў 1998 г., склала 445,2 млн.руб. З разліку штатнай колькасці работнікаў ГДУ на ўказаную дату (1060 чалавек) адначасовая матэрыяльная дапамога склала па 420 тыс. руб. на кожнага працуючага. Выплаты былі зроблены ў два этапы – па 220 і 200 тыс.руб. па меры паступлення сродкаў на разліковы рахунак універсітэта.

Для выплаты матэрыяльнай дапамогі ў большым памеры – г.зн. да 50 працэнтаў пасадавых акладаў – неабходна было стварыць эканомію сродкаў на аплату працы на 30.12.98 г. у суме 1 млрд. 900 млн.руб. Дадатковыя сродкі на ўказаныя выплаты Міністэрствам фінансаў Беларусі не выдзяляліся.

СПАРТЫЎНАЯ ХРОНІКА

## ВЫСОКІЯ ДАСЯГНЕННІ НАШЫХ ВЕТЭРАНАЎ

У Мінску прайшлі рэспубліканскія спаборніцтвы па цяжкай атлетыцы сярод ветэранаў, прысвечаныя памяці заслужанага майстра спорту СССР Яўгена Новікава.



Майстар спорту СССР, дацэнт кафедры філасофіі Аляксей Фяськоў падняўся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару.

* * *

У г.Жодзіна завяршыўся чэмпіянат Беларусі па пауэрліфтынгу і жыму штангі ў стане лежачы.

Намеснік дэкана па выхаваўчай і спартыўна-масавай рабоце матэматычнага факультэта майстар спорту Уладзімір Галавач вярнуўся ва універсітэт з дзвума залатымі медалямі.

* * *

У Мінску прайшоў рэспубліканскі турнір па фехтаванню. Майстар спорту СССР, экс-чэмпіён СССР дацэнт кафедры фізічнага выхавання і спорту Венядзікт Лісоўскі ўдастоены бронзавага медаля ў спаборніцтвах шпажыстаў.

*Зіма. Снягі. Мароз. Завеі.*
*Дарога звонкая, як сталь.*
*Бярозы ў шэрані сівеюць,*
*Палі бялеюць, як паркаль.*

*А лес стаіць маўклівы ціха,*
*Не зварухне сваіго галля...*
*Зіма, зіма... Бы ў цвеце ліпа,*
*У белым снезе ўся зямля.*

## *Улыбнитесь*

***

*– Помните, – назидательно сказал профессор, – человек должен постоянно познавать самого себя.*

*– Разумеется, – взял слово студент, – но ведь за это время можно было завязать немало более приятных знакомств.*

***

*– Скажите, сколько лет длилась Тридцатилетняя война? – спросил преподаватель у студента.*

*– Не помню.*

*– Тогда скажите, сколько лет одиннадцатилетнему мальчику?*

*– Одиннадцать.*

*– Хорошо. Ответьте теперь, сколько же лет длилась Тридцатилетняя война?*

*– Одиннадцать лет.*

***

*Студент на занятиях прочитал наизусть один из сонетов Шекспира.*

*– Отлично, – кивнул преподаватель. – А теперь попытайтесь раскрыть содержание этого произведения.*

*– Не могу.*

*– Почему же?*

*– Я не слушал, когда читал.*

***

*На экзамене по уголовному праву профессор спрашивает:*

*– Можете ли вы мне сказать, что такое обман?*

*– Это произойдет, профессор, если вы меня провалите.*

*– Поясните, почему?*

*– По уголовному кодексу обман совершает тот, кто, пользуясь незнанием другого лица, причиняет этому другому лицу ущерб.*

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
- усеагульнай гісторыі – ст. выкладчыка;
- беларускай мовы – дацэнта;
- вышэйшай матэматыкі – дацэнта;
- рускай літаратуры – дацэнта;
- экалогіі – заг.кафедры;
- геалогіі і разведкі карысных выкапняў – заг.кафедры;
- алгебры і геаметрыі – дацэнта;
- ВМ і праграміравання – ст. выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 23.
Падпісана да друку 16.01.1999 г.